**УДК 821.161.3-821:801.7**

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПРОЗА ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ: ДА ХАРАКТАРЫСТЫКІ ЖАНРУ

***канд. філал. навук, дац. Н.Б. ЛЫСОВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Разглядаюцца гістарычныя раманы, аповесці і апавяданні Людмілы Рублеўскай з пункту гледжання жанравых характырыстык. Даказана, што пісьменніца піша і ў жанры класічнага гістарычнага рамана, і ў жанры гісторыясофскага рамана, і постамадэрнісцкага новагістарычнага раманнага аповеда. Пісьменніца працуе і ў рэчышчы альтэрнатыўнай гісторыі, ствараючы літаратурную містыфікацыю – горад Б*, і карыстаецца прыёмамі дэміфалагізацыі, беларускай гістарычнай прозы, мележавакараткевічаўскай традыцыі.*

Людміла Рублеўская – паэтэса, празаік, журналіст (дакладней, пісьменнік-аглядальнік), яна піша на рэлігійныя і любоўныя тэмы, выступае ў друку па праблемах асветніцтва і масавай культуры, кранае пытанні выхавання, псіхалогіі і развіцця літаратурнага працэсу… Але перш за ўсё, яна піша пра гісторыю Беларусі. Першаснасць пацверджана колькасна: раманы «Золата забытых магіл», «Скокі смерці», «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію», «Сутарэнні Ромула», «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега», аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара», «Сэрца мармуровага анёла», «Дзеці Гамункулуса», цыклы апавяданняў «Шляхецкія апавяданні», «Ночы на Плябанскіх млынах», «Казкі з хутара Юстыны», «Старасвецкія міфы горада Б*» і іншыя творы, гістарычная прастора якіх сягае ад міфалагічнай старажытнасці да XX стагоддзя. Рублеўскай належаць і газетныя нарысы пра жыццё вядомых тутэйшых продкаў, асабліва шляхецкага паходжання: пра польскую каралеву з праваслаўнага беларускага роду Софью Гальшанскую і пра шляхетнага аферыста Рыгора Остыка, пра князя Іераніма Фларыяна Радзівіла, які таксама, як і славуты Сіняя Барада, жорстка абыходзіўся са сваімі жонкамі, і пра няверную жонку другога Радзівіла Пане Каханку – Тэрэзу Караліну, пра летуценніка канюшага Вялікага княства Літоўскага, князя Святой Рымскай імперыі Удальрыка Крыштафа Радзівіла і пра летапісца часоў Вялікага Княства Фёдара Еўлашэўскага і інш. У сааўтарстве з вядомым навукоўцам, гісторыкам Віталем Скалабанам пісьменніца стварыла кнігу дакументальных нарысаў, эсэ і п’есы пра драматычнае існаванне нацыянальнай савецкай інтэлегенцыі ў першай палове XX стагоддзя («Время и бремя архивов и имён: очерки, эссе, пьеса»). Пісьменніцы належыць таксама эсэісцкае выкладанне гісторыі беларускай літаратуры ад творчасці паэта, летапісца і рыцара Рэнесансу Андрэя Рымшы да лірыкі «палескай птушкі» Яўгенні Янішчыц («Рифма ценою в жизнь»). І ў сваёй паэтычнай творчасці пісьменніца ўсё больш глядзіць у мінулае, ствараючы гістарычныя вобразы ад Еўфрасінні Полацкай XII стагоддзя з балады «Еўфрасіння» да раскрыжаваных сталінскай навалай «ціхіх паэтаў» з верша «Два крыжы 1937 года». Чытаючы вершы Рублеўскай, быццам бачыш «продкаў, амаль што забытых, жытло» («Радавое гняздо») [1, с. 14].

Рухомасць існавання пісьменнніцы, здаецца, вядзе да рознабаковасці гістарычнага мастацкага асэнсавання. Людміла Рублеўская працуе і ў класічным гістарычна-прыгодніцкім жанры, і ў жанры гістарычнага нарыса, і ў постамадэрнісцкім новагістарычным раманным аповедзе. Мы паспрабуем разгледзець некаторыя жанравыя разнавіднасці яе гістарычнай прозы.

Праблема структурнага вызначэння жанру гістарычнага твору сёння набывае актуальнае значэнне, таму што пашыраецца колькасць гістарычнай літаратуры, што абумоўлена крызісам ідэнтычнасці цэлых народаў і набываннем імі новага дзяржаўнага статусу, што, у сваю чаргу, і выклікае цікавасць да мастацкага пераасэнсавання гісторыі. Геапалітычныя працэсы адбываюцца на фоне стылістычных змяненняў у прыгожым пісьменстве, звязаныя з пашырэннем інфармацыйнай прасторы, што дазваляе пісьменніку лёгка набываць веды аб далёкім мінулым і шырока, вольна выкарыстоўваць іх у сваіх творах.

Сама Рублеўская як журналіст стала арганізатарам газетнай дыскусіі на тэму вызначэння сённяшняй гістарычнай беларускай прозы [2], якая абмежавалася пытаннямі адносінаў гістарычнай прозы да рэальнай гісторыі, праблемай аўтарскага вымыслу наконт гісторыі і, па вялікім рахунку, тэарытычна кранала толькі жанр гістарычнага фэнтэзі, ці альтэрнатыўнай гісторыі. А сённяшняя беларуская гістарычная проза намнога шырэй ў жанравым праяўленні. Можна пагадзіцца з крытыкам Ірынай Шаўляковай, якая гаворыць пра тое, што «праблема эфектыўнасці жанрава-стылявой стратэгіі “выжывання” (яе стракатасці, разнапланавасці – *Л. Н.*) нацыянальнага прыгожага пісьменства ў нераўнавеснай культурнай парадыгме інфармацыйнага грамадства застаецца на перыферыі ўвагі беларускага літаратуразнаўства і крытыкі» [3, с. 111]. Гэта яшчэ раз гаворыць аб актуальнасці нашага аналізу.

Дастаткова ўзгадаць хаця б такія гістарычныя раманы апошняга, 2012, года, як «Гасударыня і епіскап» Алега Ждана, «Сім победиши» Алеся Пашкевіча і «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» Люд-

мілы Рублеўскай. Калі ў першым асабістая гісторыя будаўніка нямецкага паходжання Юргена Фінберга распавядаецца ў межах гістарычных падзей 220-ці гадовай даўніны на тэрыторыі Магілёўшчыны і Санкт-Пецярбургу, якія вызначаюць амаль хранікальную ходу літаратурных падзей, то ў другім – гісторыя евангельскага аповеду, інкунабулы ад Яна, кранае лёсы многіх вядомых людзей, рэальных і выдуманых, якія жывуць на межах пятнаццатага і шаснаццатага, дваццатага і дваццаць першага стагоддзяў. Паколькі галоўны герой – Вялікая кніга, пастолькі ідэйна-сюжэтныя матывы раману ствараюць мазаіку літаратурных нарысаў пра час і людзей, складанне ці мадэляванне якой у чытача можа выклікаць розныя ідэі, думкі пра гістарычныя падзеі, законы гісторыі і паралелі з сучаснасцю. Раман жа Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега» напісаны ў зусім іншай стылістыцы. Яна сама вызначае жанр рамана як прыгодніцкі і фантасмагарычны.

У беларускім літаратуразнаўстве прызнана суправаджаць аналіз гістарычнай прозы спасылкамі на традыцыі караткевічаўскага прыгожага пісьменства. Але прыгаданыя аўтары ствараюць творы, не падобныя да караткевічаўскага рамантычнага гістарычнага апавядання: ні па эстэтычным настроі, ні па гістарычна-этнаграфічнай падрабязнасці, ні па ідэалагічна акцэнтаванай нацыянальна-беларускай тэматыцы. Сапраўды, гэта ўжо іншы эстэтычна-мастацкі этап развіцця літаратуры. Справядліва было абазначана літаратуразнаўцай Аксанай Бязлепкінай наяўнасць у сучасным літаратурным працэсе трох этапаў развіцця гістарычнай прозы: «Караткевіч і кампанія» – гэта рамантычная гістарычная проза. А ў сярэдзіне 1980-х пачалася так званая тэндэнцыя інтэлектуалізацыі гісторыі, спроба прапанаваць ёй аўтарскую канцэпцыю. … Аднак нельга бясконца прапаноўваць канцэпцыі гісторыі, гэта сябе вычэрпала. Наступны этап – адыход ад гістарычнай прозы. Напачатку 2000-х гадоў з’яўляюцца прыгодніцкая літаратура, авантурная, фантасмагорыя, містыфікацыя… Тэксты, дзе гісторыя – проста фон для сюжэта» [2, с. 8]. Гістарычныя творы Людмілы Рублеўскай маглі б стаць прыкладам усіх трох тэндэнцый, пазначаных крытыкам, якія, на наш погляд, не толькі храналагічна адпавядаюць беларускаму літаратурнаму працэсу, але і характэрныя творчасці тых ці іншых пісьменнікаў, або асобным творам літаратара. Што мы і паспрабуем даказаць на прыкладзе творчасці Рублеўскай.

Да сённяшняга часу ўзорам **рамантычнай гістарычнай прозы** Людмілы Рублеўскай лічыўся цыкл «Шляхецкія апавяданні», іншыя яе творы крытыка адносіла да новагістарычнай прозы [3, с. 112 – 113]. На наш погляд, апошні раман пісьменніцы «Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега», нягледзячы на аўтарскае (ці рэдактарскае) вызначэнне «фантасмагарычны», можна таксама аднесці да класічнага рамантычнага гістарычнага рамана. Мы выкарыстоўваем тут вызначэнне «рамантычны» ў якасці стылістычнай, фармальнай характарыстыкі. З’яўленне такога гістарычнага аповеду, прыгодніцкага, авантурнага, звязана з рэвалюцыйным аднаўленнем прозы напачатку XIX стагоддзя. Менавіта рамантычны гістарычны раман стаўся класічным для наступных пакаленняў літаратараў, у тым ліку і да новарамантычнага ўсплеску гістарычнай нацыянальнай прозы, аўтарам якой стаў у другой палове XX стагоддзя Уладзімір Караткевіч.

Зазначым, што вытокі рамантычнага гістарычнага рамана некаторыя даследчыкі бачаць ў гатычным рамане (В. Дыбеліус, В.Я. Малкіна і інш.), таму наяўнасць «фантасмагарычных» элементаў у рамане Л. Рублеўскай не шкодзіць, а падтрымлівае далучэнне яго да класічных гістарычных твораў. Тым больш што сама аўтар, напрыклад, сцвярджае рэальную магчымасць існавання некаторых, найбольш фантастычных момантаў свайго рамана. Напрыклад, «жалезнай чарапахі» (ці зброі падобнай ні то на танк, ні то на монстра) тагачаснымі фактамі культуры: «… калі ў маім рамане па Слуцку XVIII стагоддзя едзе танк на паравым рухавіку, што створаны па схемах Леанарда да Вінчы, гэта, канешне, гістарычнае фэнтэзі. Але я назбірала дастаткова фактаў: падобныя эксперыменты ў той час у Еўропе праводзіліся. Напрыклад, малады вучоны Кюнью спрабаваў перавесці французскую артылерыю на сваю ходу» [2, с. 9].

Структура класічнага гістарычнага рамана складаецца, згодна з канцэпцыяй В. Дыбеліюса [4], з інтрыгі, якая яднае палітычную гісторыю з лёсам літаратурных герояў, таямніцы, падарожжа, гісторыі кахання і духоўнага змянення. Авантурнасць Н. Тамарчанка разглядае як галоўны, структурны і сэнсавы прынцып класічнага гістарычнага твора, які афармляецца ў тыповыя кампазіцыйныя формы з пэўнай паслядоўнасцю падзей – выбар жыццёвага шляху, пастка, бойкі, палон, суд, прычым згаданая паслядоўнасць матываў можа паўтарацца ці будавацца цыклічна [5]. Структура апошняга рамана Рублеўскай адпавядае гэтым хаарктарыстыкам: ёсць жарсць і каханне да Чароўнай Дамы, неверагодныя прыгоды з пасткамі, палонам, уцёкамі, і ўсё гэта на фоне рэальных палітычных інтрыг і тагачаснай культуры.

Наяўнасць дакладнага гістарычнага фону авантурнага стагоддзя з яго касцюмамі і інтрыгамі, алхіміяй і рацыянальнымі ведамі ды асветніцкімі планамі ўмацавана ў рамане Рублеўскай пэўнымі гістарычнымі асобамі (харужым вялікім літоўскім Геранімам Фларыянам Радзівілам Жорскім, вялікім гетманам Міхаілам Казімірам Радзівілам Рыбанькам, полацкім ваяводам Аляксандрам Сапегам, ваяводам Мінскім Міхалам Багінскім і інш.), якія выконваюць другасную ролю ў аповедзе кніжнай гісторыі, але першасную ў сюжэтнай калізіі рамана аб пошуках Рамфеі, часткі каралеўскіх рэгалій, валоданне якой ва ўмовах барацьбы за ўладу робіцца архіважным.

Авантуры, ці прыгоды, галоўных герояў – збяднелага шляхціча і беглага вучня калегіума Пранціша Вырвіча і сына полацкага гарбара, доктара навук, былога алхіміка Бутрыма Лёдніка адбываюцца ва ўмовах каларытна выпісанага гістарычнага фону. Пісьменніца скрупулёзна апісвае тагачасныя плёткі і касцюмы, пітво і ежу, традыцыі і забабоны. Напрыклад, вось як багата апісаны стол у замку Радзівіла (Гераніма): «Птахі з выкручанымі крылцамі і шыямі, фаршыраваныя грыбамі і садавінай… Шчупакі, з галавы адвараныя, у сярэдзіне запечаныя, з хваста засмажаныя… Парсючкі з прыстаўленымі крыламі… Срэбныя сервізы – складаныя канструкцыі з талерак на вытанчаных маленькіх калонах, упрыгожаныя выявамі антычных багоў, прыпадабняліся славутаму рогу казы Амалфеі, на іх навалілі ўсялякае смакоцце, ад лімонаў да марцыпанаў. На ніжняй талерцы паціху плавіліся “італьянскія лёды”, і кожны сервіз стаяў на круглым люстэрку. Раскоша!» [6, с. 104].

У «Авантурах…» можна вызначыць некалькі радоў герояў. Асобны рад звязаны з ужо згаданымі гістарычнымі асобамі, што ўтвараюць гістарычны фон дзеяння. Тытульны рад звязаны з галоўным героем, юнаком Вырвічам, яго прыгодамі, знешнімі, і выпрабаваннямі характару, пачуццяў, годнасці – наогул з яго выбарам у жыцці. Галоўны герой апошняга рамана Рублеўскай быццам яднае характарыстыкі д’Артаньяна і Гервасія Вылівахі, дэманструючы юнацкую рашучасць, разбэшчанасць, ганарлівасць і прагу жыцця адначасова са сталай мужнасцю, разумнасцю і дабрынёй. Зноў жа, згодна з традыцыяй класічнага гістарычнага рамана, галоўны герой не звязаны з ніводнай палітычнай партыяй, па сваім статусе і ўзросце ён знаходзіцца на мяжы гістарычных падзей і тым самым дае магчымасць вольнай пабудовы авантурнага сюжэта.

З французскімі раманамі твор пісьменніцы яднае яшчэ і барацьба за каралеўскія каштоўнасці, і вобраз вернага хорта Багінскіх барона Германа Ватмана, які ўвасабляе сабою і ваяўнічасць каралеўскіх гвардзейцаў, і моц Партоса. А з айчыннай літаратурна-гістарычный традыцыяй, канешне, героі з Полацка – Бутрым Лёднік і Саламея Рэніч. У сістэме герояў рамана Рублеўскай яны займаюць вельмі важнае, нацыянальна-ідэалагічнае значэнне. Яны створаны як своеасаблівы парафраз нацыянальных герояў палачаніна Францыска Скарыны і лекаркі з Наваградчыны Саламеі Русецкай-Пільштынавай. У кнізе Рублеўскай яны, дасведчаныя ў навуках і жыцці, не проста сустракаюцца ў адным раманным аповедзе, іх яднае вернае каханне. Пісьменніца стварае сапраўды нацыянальных рамантычных герояў, якім характэрны мудрасць, выхаванасць, чалавечая годнасць і сумленне.

Пры гэтым знакавай прасторай, што звязвае з дзяцінства герояў, з’яўляюцца знакамітыя «лабірынты Полацка», уведзеныя ў нацыянальную літаратурную традыцыю яшчэ напачатку былога стагоддзя пачынальнікам сучаснай неарамантычнай гістарычнай традыцыі Вацлавам Ластоўскім. Паэтыка яго знакамітай аповесці «Лабірынты» (1923) вельмі блізкая да індывідуальнай манеры нашай сучасніцы і не аднойчы паўтараецца ў яе творах. «Прастора-часавыя зрухі ў фабуле твора, незвычайныя здольнасці героя-апавядальніка суіснаваць у мінулым і сучасным, свабодна пераадольваць іх межы, трансфармацыя рэальнасці ў фантастычнае блуканне па старажытных лабірынтах…» [7, с. 14] – гэта аналіз паэтыкі «Лабірынтаў» Ластоўскага, а не «Сутарэнняў Ромула», ці «Скокаў смерці», ці «Гульні ў Альбарутэнію» і іншых твораў Рублеўскай.

Аднак аўтарка «Авантур…», апісваючы слаўны беларускі горад, неяк спакваля руйнуе літаратурны міф аб Полацку XVIII стагоддзя, створаны папярэднімі пісьменнікамі (У. Арловым у «Дні, калі ўпала страла», Л. Дайнекай у «Мячы князя Вячкі»), – міф аб «багатым горадзе, які славіцца рамёствамі, феадальна-рамесніцкай дэмакратыяй, цэрквамі і манастырамі» [8, с. 6], «асяродку культуры і пісьменства» [8, с. 8], «прасторы, ізаморфнай дзяржаве, што адыграла значную ролю ў палітыцы, эканоміцы, культуры свайго часу» [8, с. 8]. У новым рамане аб Полацку Рублеўская абмежавалася змрочным апісаннем сутарэнняў слаўнага горада: «У цёмных адгалінаваннях, у якія яны не зварочвалі, мроіліся прывіды, нечыя чырвоныя вочы і здавалася, зараз адтуль нехта выпаўзе, кінецца… Але кідаліся толькі пацукі. Яны прабягалі проста пад нагамі, нібыта аслеплыя і аглухлыя, не маючы ніякага страху перад прыхаднямі, ды ім не варта было баяцца – бо тут у іх быў **свой горад**, са сваім каралём, мільённай арміяй, сваімі законамі і звычаямі» [6, с. 228]; апісаннем горада напярэдадні бітвы: «Сонца схавалася за абрысамі Сафіі, і храм здаваўся караблём з двума матчамі, на які мог сесці любы, але дапялі прыйсці толькі адзінкі, вось яны цяпер і адплывуць услед за сонцам у свет святла, а тут застануцца грэшнікі смакаваць імгненні пагібелі» [6, с. 225]; а таксама апісаннем гарадскога краявіду ў час бойкі: «Брукаванка Полацку не першы раз была залітая крывёй – нібыта смерць спадзявалася, што, паліваючы камяні, яна вырасціць сабе адданае войска. Але нашто ёй войска? Людзі і так служаць смерці, зацята адбіраючы жыцці адно ў аднаго. Метал стукаў аб метал, нібы выбіваўся жудасны рытм **смяротных скокаў**. Асабліва страшна атрымлівалася, што брукаванку засцілала тонкае покрыва снегу, і кроў проста крычала на белым тле» [6, с. 259]. Як бачым, прэзентацыя беларускай тэмы (ці гісторыі нацынальнага горада-сімвала) у рамане Рублеўскай падаецца праз класічны для пісьменнікаў-рамантыкаў гатычны ідэал мінулага – «скокі смерці».

У творчасці пісьменніцы ёсць і **гатычны раман**. Заўважым, што гатычная традыцыя паспрыяла ў свой час узнікненню жанра гістарычнага рамана. У гатычным рамане Рублеўскай «Скокі смерці» вобраз Беларусі прапісаны, як вобраз сноў пра Беларусь, адэпты якіх, жывыя і мёртвыя, трымаючыся адзін за

аднаго, гінуць у вар’яцкім карагодзе. Але гэта – ідэйна-вобразнае начыненне рамана. Імкненне пісьменніцы вызначыць беларусчыну ў сваіх творах праз класічныя мастацкія вобразы ці «скокаў смерці», ці «трыумфу смерці», ці «дзяўчыны і смерці» заслугоўвае больш падрабязнага аналізу, тым больш што вакол вобразу смерці «з незапятных часоў круціцца сэнсавая карусель эстэтычнага ўвасаблення, як круціцца яна (смерць) вакол жыцця…» [9, с. 26]. Нас жа цяпер цікавяць элементы паэтыкі гатычнага рамана.

Сюжэт рамана «Скокі смерці» разгортваецца ў сучаснасці (зноў у «лабірынтах», але на гэты раз – у пошуках разгадкі таямніцы старажытнага гадзінніка і гісторыі старога горада) і ў гістарычнай прасторы пятнаццатага стагоддзя ў часы заняпаду слаўнага горада Старавежска, дакладней, у прасторы сноў сучаснай гераіні рамана Ганны, што бачыць у мінулым гісторыю свайго двайніка – дачкі бургамістра Анеты. Раман Рублеўскай напісаны ў суладдзі з паэтыкай гатычнага рамана. Тут намалявана асобая прастора – вежа-замак, сучасныя падзеі ў якой звязаны з раскрыццём гісторыі горада і рода, забойстваў і таямніц. У рамане разгортваецца этычны канфлікт паміж адмоўнымі героямі, што прагнуць нажывы і чалавечых жыццяў дзеля асабістага задавальнення, і галоўнымі героямі, летуценнікамі, журналісткай-паэтэсай Ганнай і майстрам-рэстаўратарам Юрасём Дамагурскім. Ёсць і звышнатуральны элемент – цудадзейны механізм гадзінніка, які можа падпарадкоўваць людзей, іх волю і моц.

Але элементы «класікі» ізноў прапісаны аўтарам (у гістарычнай частцы рамана часоў Сярэднявечча): інтрыга, якая яднае палітычную гісторыю з лёсам літаратурных герояў (барацьба вольных гарадоў з уладай вялікага князя на фоне контррэфармацыі, інквізіцыі і эпідэміі чумы), таямніца (не столькі цудадзейны гадзіннік лекара Бернацоні, колькі палітычныя інтрыгі вялікага князя з каталіцкай царквой), падарожжа (спроба сабраць войска і вызваліць горад і паланянку з башні-крэпасці), гісторыя кахання шляхцянкі Анеты і ваяра Богуша і іх духоўнага змянення (змова з прыслужнікамі князя, здрада гораду і адмаўленне каханню вядуць да пераўтварэння ў рыцара Балеслава Радчынскага і манахіню сястру Агапу).

У большасці раманаў Л. Рублеўскай («Скокі смерці», «Сутарэнні Ромула», «Гульня ў Альбарутэнію» і інш.) прысутнічае падвоеная часовая гісторыя (мінулае і сучаснасць), што адразу накіроўвае крытыкаў да рамана У. Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». «Паралелізм часоў» літаратуразнаўца І. Шаўлякова лічыць рысай так званага новагістарычнага, або «гісторыяцэнтрычнага», рамана сучаснасці. Пры гэтым Шаўлякова справядліва азначае, што «ў «гісторыяцэнтрычных» раманах Л. Рублеўскай канцэпт між-быцця рэалізуецца на розных узроўнях мастацкай структуры твораў, абумоўліваючы не толькі спецыфіку (сюжэтна-кампазіцыйную і вобразна-выяўленчую) уласна тэксту, але і магчымасць цэлага веера інтэрпрэтацый падтэксту, а таксама вектар «выхаду» мастацкіх ідэй у сённяшні сацыякультурны кантэкст» [3, с. 114].

Але спроба суаднесці часы, выправіць мінулае сучаснымі ідэямі і рэальнасцю існавала ў літаратурным працэсе і раней. Юры Тынянаў у артыкуле «Аб літаратурнай эвалюцыі» (1927) гаворыць аб тым, што паэтыка рамана Талстога «Вайна і мір» зусім непадобна да рамана Загоскіна на тую ж гістарычную тэму і што гістарычны раман Талстога больш суадносіцца з сучаснай яму прозай [10, с. 276]. Так, ужо напрыканцы XIX – напачатку XX стагоддзя нараджаецца **гісторыясофскі раман**, якому характэрна асучасненая гісторыя, ці аўтарская інтэрпрытацыя гісторыі. Паэтыка гісторыясофскага рамана будуецца на парушэнні рамантычнага і ўвядзенні рэалістычнага аповеду. Замест авантурнасці, цэласнасці інтрыгі, прапануецца ілюстрацыя суб’ектыўнага бачання вялікага прамежку часу, якая падобна да мазаікі гістарычных часоў, герояў, што паяднаны думкаю аўтара аб сучасных падзеях і ідэях. Гаворачы сімвалам аднаго з раманаў Рублеўскай, адбываецца літаратурная гульня на гістарычную тэму.

Гісторыясофская канцэпцыя Людмілы Рублеўскай беларусчыны («скокі смерці», «Альбарутэнія», кроўная еднасць Ромула і Рэма) стала вызначальнай для падвоенай структуры яе раманаў. Калі Караткевіч тлумачыў сучасную нацыянальную канцэпцыю ў рамане «Чорны замак Альшанскі» гісторыямі здрады сваіх жа ў мінулым (у ВКЛ ці ў часы Другой сусветнай вайны), то Рублеўская прапануе эсхаталагічнае бачанне смерці Ідэі і чаканне нараджэння новага Беларуса.

Сюжэтам раманаў «Гульня ў Альбарутэнію» і «Сутарэнні Ромула» становяцца гісторыі кахання з нараджэннем ці планаваннем нараджэння наследніка. Што тычыцца гістарычнай часткі раманнага аповеду, то яна страчана, сышла ў нябыт. Зачыніўся ўваход у 1930-я гады, на гэтым месцы пабудаваны новы дом, жывуць далёкія ад беларусчыны людзі, – у рамане «Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію». Заваліліся «сутарэнні» былога княскага храму, а сакральны кубак становіцца сімвалам зліцця двух варожых гістарычных родаў у адзіную сям’ю, наследнікаў якой раманіст (і літаратурны, і сапраўдны) пакідае ў «палаце нумар шэсць» (!), куды вязуць «чарговага скалечанага незалежным жыццём беларускага індывіда ў абдоймы самай бясплатнай у свеце медыцыны» [11, с. 517] – так заканчваецца раман «Сутарэнні Ромула». Ірацыянальнаясць беларускай ідэі, тоеснасць яе носьбітаў з гульцамі, летуценнікамі, непрактычнымі людзьмі, або … вернікамі, якія ўвайшлі ў прастору вялікай ідэі і ўжо не могуць ніколі ад яе «адмовіцца, як не можа крыж пазбавіцца ад адной з перакладзін і застацца крыжам» [11, с. 7]. Апошні тэзіс выглядае як праграмная думка гістарычнай пісьменніцы, таму што без канфесійнай сімволікі не абыходзіцца ў большасці твораў Рублеўскай. Так, эпіграфам да рамана-інструкцыі (як вызначае яго аўтар)

«Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію» служаць словы: «Мы прыйшлі ў гэты свет не для таго, каб праклінаць цемру, а для таго, каб запаліць у ім святло» [11, с. 7].

Свой улюбёны прыём суаднясення сучаснасці і мінулага праз стварэнне паралельных сюжэтных матываў сама Рублеўская называе ў адным са сваіх газетных артыкулаў «эффектам пападанца» [12, с. 14]. Аналізуючы класічны прыклад з рамана У. Караткевіча «Чорны замак Альшанскі» падмены сучаснага героя гістарычным двайніком (Космач-Валюжыніч), Рублеўская іранічна вызначае такі літаратурны матыў, як «ціха, сам з собою» (зноў «палата нумар шэсць»?!).

Мэтаю суаднясення часоў становіцца ўнутраная размова ці развconfigured аўтара наконт гістарычных працэсаў, падзей ці іх вынікаў. Крытыка называе гэты працэс «рэміфалагізацыяй»: «… грунтам у прозе Л. Рублеўскай (і, прынамсі, у істотнай частцы “гісторыяцэнтрычных” твораў апошняга дзесяцігоддзя) з’яўляецца нацыянальны Міф, калі быць больш дакладным, – ідэя рэміфалагізацыі годных, а таму непазбежна трагічных старонак (перыядаў, падзей, асоб і да т.п.) гісторыі *беларусчыны*» [3, с. 113]. Аднак літаратурнае запаўненне «белых плямаў» гісторыі – працэс, які суправаджаецца як рэміфалагізацыяй, так і дзейсна – міфалагізацыяй. Нам падаецца, што сярод гістарычных твораў Рублеўскай апошняя тэндэнцыя дамінуе. Яна – майстра ствараць **альтэрнатыўныя літаратурныя гісторыі, або міфалагізаваныя**. І сінхроннае існаванне двух гістарычных пластоў часу яшчэ толькі форма літаратурнага гістарычнага аповеду, а не ідэя яго інтэрпрэтацыі.

Сапраўднай літаратурнай гістарычнай містыфікацыяй Людмілы Рублеўскай з’яўляецца горад Б* (цыкл апавяданняў «Старасвецкія міфы горада Б*»), што існуе недзе на мяжы ХІХ і ХХ стагоддзяў, паміж Польшчай і Расіяй. Тут ёсць свая карчма і свой тэатр, свая пошта і свае гастралёры, свае легенды і свае забабоны… Жыхароў горада (старых і маладых, жанчын і мужчын, прафесіяналаў і аматараў…) яднае агульны лёс і парадак, што напісаны на нябёсах, ці… у антычнай міфалогіі. Гаворачы словамі самой пісьменніцы, «у жаданні апынуцца ў іншым часе, ёсць заўжды патрэба слабога збегчы. Але яшчэ ў антычнасці ведалі, што ў падарожжа ты ўсё роўна бярэш самога сябе» [12, с. 14].

Кожнае апавяданне цыклу «Старасвецкія міфы горада Б*» («Узнясенне Ганімеда», «Артэміда і Актэон», «Апалон і Марсій», «Арфей і Эўрыдыка» і інш.) – іранічнае (зніжанае) паўтарэнне міфалагічнай гісторыі ў другім побытавым, сацыяльным кантэксце. І гэты гістарычны кантэкст – нацыянальны, беларускі.

Сама пісьменніца, апісваючы «эфект пападанца», гаворыць аб тым, што «ў нішы альтэрнатыўна-гістарычных раманаў поўна макулатуры» [12, с. 14]. Можа таму героі горада Б* (чытай, Беларусі) – прадстаўнікі так званай сацыяльна-масавай культуры, іх не турбуе лёс Айчыны і палітычныя працэсы. Яны падобны на герояў гістарычных (калі лічыць, па эўгемераўскай традыцыі, міф гісторыяй) анекдотаў, у якіх не трэба шукаць ідэалогіі інтэрпрэтацыі беларусчыны, або міфалагічнага «вечнага» парадку. Пісьменніца дапісвае шматварункавыя варыянты гісторыі Беларусі і робіць гэта па-постмадэрнісцку іранічна.

Іншы раз іронія пісьменніцы балансуе на мяжы з сарказмам. Гэта пра стылістыку «Шляхецкіх апавяданняў» і містычнай аповесці «Ночы на Плябанскіх млынах». Падобны эстэтычны настрой літаратурнай містыфікацыі Рублеўскай узамацняецца ў асобных яе «забытых» вершах:

«Ён проста звык у твані жыць – і жыў,
Дрыгвою дыхаў, харчаваўся раскай,
Між небам і зямлёю, на мяжы,
Якую называлі страшнай казкай.
Ён не аброс лускою, не пачаў
Падобным быць да жабы ці трытона.
Ён проста сноў не бачыў, апрача
Балотных сноў, бясколерных, бяздонных.
Свае былі тут радасць і краса:
Пунсовым жалем спелі журавіны,
Гарлачык ззяў, свяцілася раса.
І думаў ён: няма найлепш краіны!
Дзень амярцвеў, бы кветкі амялы.
Адно пытанне не даецца ў рукі:
Нашто яму на спіне два крылы?
Бо так нязручна з імі між гадзюкаў» (Хома Балоцікус) [13, с. 7].

Горад Б* ці звычайны беларускі горад, балотны чалавек ці людзі на балоце, або Пані з «гэтымі» на конях і быццам у тумане з апавядання «Дзённік Пані»… Сапраўды дэміфалагізацыя, але беларускай гістарычнай прозы, мележава-караткевічскай традыцыі.

Трэба сказаць, што сярод твораў сучаснай беларускай літаратуры аматараў ствараць іранічныя альтэрнатыўныя гісторыі Беларусі дастаткова: ад Ф. Сіўко з «Удогам» да С. Балаханава з яго «Імя грушы» і

«Зямлёй пад крыламі Фенікса» або М. Клімковіча і В. Ахроменкі з «Наездам на Літву» і «Праўдзівай гісторыяй Кацапа, Хахла і Бульбаша». Таму можна гаварыць нават аб традыцыі альтэрнатыўнай літаратурнай гісторыі ў сучаснай беларускай прозе. Крытыка вызначае гэту традыцыю як «адыход ад гістарычнай прозы» [2, с. 8]. Але, на наш погляд, гэта адыход ад рэалістычнага аповеду аб гісторыі краіны і новая спроба літаратурна пераасэнсаваць гістарычны вопыт (праз вопыт сваіх папярэднікаў-літаратараў).

Гісторыя не мае адзінкавага шляху развіцця, яе хада не толькі палітычна ці навукова вызначаная. Яна запісваецца і ў гістарычных міфах, легендах, паданнях, анекдотах, сямейных апавяданнях, гісторыях маргіналаў і, канешне, у літаратурных аповедах. Тым больш, кажучы словамі гісторыка Віталя Скалабана, сааўтара і аднаго з герояў нарысаў Л. Рублеўскай, што «ў дакументах кепскае захоўваецца лепей, чым добрае. Проста лепшае не фіксуецца» [14, с. 9]. Літаратары выцягваюць з небыцця ці ствараюць нанова лепшых гістарычных герояў і больш правільныя, новыя погляды на падзеі мінулага. Гэта – не адыход ад гісторыі, а паглыблены ўваход у яе, з новымі фармальна-жанравымі здабыткамі.

ЛІТАРАТУРА

1. Рублеўская, Л.І. Шыпшына для Пані: вершы і эсэ / Л.І. Рублеўская. – Мінск: Маст. літ., 2007. – 254 с. – (Беларуская паэзія XXI стагоддзя).
2. Фантасмагория на тему истории. Дискуссия // СБ Беларусь сегодня. – 2013. – 20 марта. – С. 8 – 9.
3. Шаўлякова, І. Сутарэнні Альбарутэніі: рэміфалагізацыя беларушчыны ў «гісторыяцэнтрычных» раманах Л. Рублеўскай / І. Шаўлякова // Тэксты. Альманах. – Мінск: Галіяфы, 2012. – № 2. – С. 111 – 121.
4. Проблемы литературной формы / О. Вацель [и др.]; / общ. ред. и предисл. В.М. Жирмунского; пер. с нем. М.Л. Троицкого [и др.]. – М.: КомКнига, 2007. – 240 с.
5. Тамарченко, Н.Д. Теория литературы: в 2 т. / Н.Д. Тамарченко. – М.: Изд-во «Академия», 2004. – Т. 1. – 513 с.
6. Рублеўская, Л. Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега. Раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Л. Рублеўская. – Мінск: Рэдакцыя газеты «Звязда», 2012. – 272 с.
7. Шынкарэнка, В.К. Нястомных пошукаў дарога. Праблемы паэтыкі сучаснай беларускай прозы / В.К. Шынкарэнка. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – 216 с.
8. Бароўка, В.Ю. Полацк і Полаччына XVIII стагоддзя ў творах Я. Ніедрэ і беларускіх празаікаў другой паловы XX стагоддзя / В.Ю. Бароўка // Вестн. Полац. дзярж. ун-та. Сер. А. Гумнітарныя навукі. – 2013. – № 2. – С. 5 – 8.
9. Харт Ниббриг Кристиан, Л. Эстетика смерти / Л. Харт Ниббриг Кристиан; пер. с нем. Л. Белобратова. – СПб.: Изд-во Ивана Лимбаха, 2005. – 424 с.
10. Тынянов, Ю.Н. Поэтика. История литературы. Кино / Ю.Н. Тынянов. – М.: Наука, 1977. – 574 с.
11. Рублеўская, Л. Сутарэнні Ромула: раманы / Л. Рублеўская. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 520 с.
12. Рублевская, Л. Про эффект попаданца / Л. Рублевская // СБ Беларусь сегодня. – 2012. – 5 дек. – С. 14.
13. Рублевская, Л. Забытыя словы. Вершы / Л. Рублеўская // Дзеяслоў. – 2012. – № 3 (58). – Травень – чэрвень. – С. 5 – 12.
14. Рублевская, Л. Человек, открывавший архивы / Л. Рублевская // СБ Беларусь сегодня. – 2012. – 4 авг. – С. 9.

*Паступіў 21.06.2013*

## THE HISTORICAL PROSE BY LIUDMILA RUBLEWSKAYA: GENRE CHARACTERISTICS

***N. LYSOVA***

*The historical novels, narratives and stories by Liudmila Rublewskaya are discussed with a view of genre characteristics. The author of the article argues that Rublewskaya writes in classical historical and historyosophic novel, as well as postmodern new history novel narrative. The writer works in alternative history genre, she creates a literary mystification – town B*, using demythologization technique, the methods of Belarusian historical prose, the tradition of Melezh and Karatkevitch.*